# II. THE SEARCH FOR NEW FORMS IN CONTEMPORARY LITERATURE

## ВІДЭАВЕРШЫ ВІТАЛЯ РЫЖКОВА: ФЕНОМЕН МЕДЫЯПАЭЗІІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Т. А. Мотрэнка**

*Аспірант,*
*УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”,*
*г. Мінск, Беларусь*

**Summary.** In the article, on the example of Vitaly Ryzhkov's media poems, the existence of the phenomenon of intermedia art is considered in the Belarusian literature. Some features of the realization of the artistic concept with the help of multimedia tools, the role of the author’s manner of presenting text are noted. Particular attention is paid to the specifics of the perception of poetry in the audiovisual format.
**Keywords:** intermedia art; artistic syncretism; multimedia; media poem.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Фармальна-зместавае аблічча паэзіі ў сучасных умовах зведвае адчувальны ўплыў экстралітаратурных фактараў, выкліканых імклівым развіццём інфармацыйных тэхналогій. Вынік гэтага ўплыву ў замежным літаратуразнаўстве атрымаў назву “медыяславеснасць”, пад якой разумеецца дынамічны феномен, што адлюстроўвае найбольш актуальныя для сучаснай культуры тэндэнцыі да сінтэзу форм, узбагачэння паэтыкі за кошт выкарыстання тэхналагічных дасягненняў, арыентацыі на дыялагічнасць і нелінейнае адлюстраванне рэчаіснасці [4, с. 365].

У айчыннай культурнай прасторы з’ява сінтэзу мастацтва слова і магчымасцей сучасных інфармацыйных тэхналогій таксама мае месца, хоць і выражаецца адзінкавымі прыкладамі творчых эксперыментаў прадстаўнікоў маладога пакалення літаратараў. Сярод іх паэт і перакладчык Віталь Рыжкоў, аўтар зборніка “Дзверы, замкнёныя на ключы” (2010), некаторыя вершы з якога існуюць у відэафармаце і па сутнасці з’яўляюцца сінтэтычнымі літаратурна-мультымедыйнымі кампазіцыямі.

Характэрным прыкладам з’яўляецца відэаролік “Дарожныя здарэнні”, дзе назіраецца цеснае ўзаемадзеянне аўдыёвізуальнага і вербальнага пачаткаў. У аснове верша аповед пра выпадак на дарозе – аўтамабіль сутыкнуўся з ласём. У апісанні падзейнага боку твора адчуваюцца экзістэнцыйныя настроі: “ты сам – гэта твае наступныя крокі і / прынятыя табой рашэнні / але ніколі не ведаеш, што цябе напаткае / ў наступны момант” [3, с. 10]. Апынуўшыся ў своеасаблівым памежным

становішчы, герой пачынае падбірацца да сутнасці свайго існавання, гучаць думкі пра немагчымасць апраўдання ўласных учынкаў справай звычкі, ствараецца атмасфера трывожнасці. Аўтарскае чытанне верша суправаджаецца музычным фонам, які задае адпаведны зместу твора настрой, ілюструецца ўрыўкамі караткаметражнага анімацыйнага фільма Л. Шмялькова “Мой асабісты лось”. Вербальнае і аўдыёвізуальнае ў непадзельным адзінстве вызначаюць мастацкую сутнасць твора, што ў сваю чаргу ўплывае на рэакцыю аўдыторыі.

Ёсць адчувальная розніца паміж чытаннем паэзіі ў традыцыйным разуменні гэтага працэсу і ўспрыманнем літаратурнага твора, які мае форму сінкрэтычнай мультымедыйнай кампазіцыі. У першым выпадку назіраем высокі ўзровень самастойнасці рэцыпіента, ад яго чакаецца не толькі эмацыянальна-пачуццёвая ацэнка выказвання – часта разуменне мастацкай ідэі паэтычнага твора, яго адэкватная інтэрпрэтацыя патрабуюць работы рацыянальнага пачатку.

У другім выпадку аўдыторыі прапануюцца гатовыя зрокавыя і гукавыя вобразы, якія актывізуюць “кліпавае мысленне”, характэрнае для чалавека інфармацыйнай эры. Крытычная ацэнка твора ў такой сітуацыі губляе сваю вартасць, як правіла, гэты этап у камунікатыўным акце паміж аўтарам і рэцыпіентам апускаецца, а меркаванне пра твор складаецца на ўзроўні “падабаецца / не падабаецца”. І хоць вершы В. Рыжкова, што маюць мультымедыйную форму, існуюць і ў традыцыйным друкаваным варыянце, ёсць пэўная частка аўдыторыі, якой такі фармат паэзіі бліжэй.

Аўдыёвізуальная паэзія мае больш шанцаў прыцягнуць увагу сучаснага пакалення маладых людзей. Яны сталеюць у эпоху імклівага развіцця мультымедыйных тэхналогій, узнікнення новых лічбавых каналаў камунікацыі, таму вымушаны, а разам з тым прывыклі паглынаць і апрацоўваць няспынны паток інфармацыі, падзелены на кароткія паведамленні, спецыфічнымі рысамі якога з’яўляюцца ілюстратыўнасць, дыялагічнасць, мабільнасць, нелінейнасць. Таму відэадоследы В. Рыжкова можна разглядаць яшчэ і як маркетынгавы сродак. Акрамя таго, мяркуем, так праяўляецца “мастацкая агрэсіўнасць” аўтара, якую звязваюць са спецыфічнасцю становішча пісьменніка ў сучаснай культурнай прасторы. Яно вымагае творцу імкнуцца любымі спосабамі “ўцягнуць чытача ў актыўную спрэчку, у дыялог з сабой, справакаваць на выяўную рэакцыю” [2, с. 145]. У прыватнасці, такім чынам гэты феномен апісвае даследчыца Г. Кісліцына, у сваю чаргу спасылаючыся на І. Ільіна, які называе падобную стратэгію “маскай аўтара” – адной з прыкмет постмадэрнісцкай эстэтыкі [1, с. 165]. Выкарыстоўваючы магчымасці мультымедыя, В. Рыжкоў вылучае сэнсавыя і эмацыйныя акцэнты у выказванні, ілюструе яго, задае настрой успрымання музычным фонам, аўтарскім інтаніраваннем, што, як падаецца, варта прыняць за спробу наладзіць асабісты дыялог з чытачом, задаць адэкватны задуме кірунак

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

інтэрпрэтацыі твора. У сітуацыі з кніжным фарматам паэзіі такую цесную сувязь складана ўявіць, паміж творцам і аўдыторыяй пралягае непараўнальна большая адлегласць, чытач застаецца сам-насам з лірычным героем, асоба аўтара знаходзіцца на другім плане.

Акрамя таго, у аўдыёвізуальным фармаце В. Рыжкоў транслюе не толькі сам твор, але і аўтарскую манеру яго падачы. Яна дапаўняе сэнсавае і эмацыйна-пачуццёвае палі мастацкага тэксту, што таксама накладвае адбітак на характар інтэрпрэтацыі верша, як, напрыклад, у творах “Два скрыпачы”, “Самае цікавае”, якія паэт чытае на камеру ў адмысловых дэкарацыях. Падобныя асаблівасці мультымедыйнай паэзіі, паводле меркавання даследчыцы Я. Салдаткінай, фарміруюць “медыявобраз аўтара” – “катэгорыя, што адлюстроўвае прафесійнае і чытацкае ўспрыманне пісьменніка ў сучаснай медыякультуры”, – у процівагу постмадэрнісцкай катэгорыі “смерці аўтара” [4, с. 360].

Заўважым, што аўдыёвізуальныя практыкі нельга назваць устойлівым накірункам у творчасці В. Рыжкова, гэта перш за ўсё эксперымент, у пэўным сэнсе авантура. Тым не менш яны змяняюць жанравую парадыгму сучаснай беларускай паэзіі, таму патрабуюць навуковай увагі разам з іншымі прыкладамі медыяславеснасці. І хоць гэтую з’яву нельга назваць прыкметнай у дачыненні да беларускага літаратурнага асяроддзя, але нават адзінкавыя эксперыменты сведчаць пра развіццё айчыннага мастацтва слова ў рэчышчы сусветнага літаратурнага працэсу.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Ильин И. Постмодернизм от истоков до конца столетия: эволюция научного мифа. – М. : Интрада, 1998. – 250 с.
2. Кісліцына Г. Пошукі новых камунікатыўных сродкаў у мастацкай літаратуры XXI стагоддзя // Полымя. – 2015. – № 2. – С. 142–146.
3. Рыжкоў В. Дзверы, замкнёныя на ключы. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2010. – 108 с.
4. Солдаткина Я. В. Понятие «медиасловесность» и актуальные процессы в современной культуре / // Преподаватель XXI век. – 2017. – № 2. – С. 356 – 368.




РЭПОЗИТОРИЙ БГПУ